

ФАРМАЦЭЎТЫЧНЫЯ АДХОДЫ — ГЛАБАЛЬНАЯ ПАГРОЗА 11

ПЕРШЫ, ХТО НАЗВАЎ СЯБЕ БЕЛАРУСАМ 12




Выдаецца з 9 снежня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

22 СНЕЖНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 249 (29363)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Дзмітрый ПІНЕВІЧ, міністр аховы здароўя:**

*«Мы зараз з асцярожным аптымізмам ужо тыдзень, можа, крыху больш, гаворым, што не бачым росту колькасці пнеўманій. У асобных рэгіёнах няма неабходнасці трымаць той ложкавы фонд, які быў перапрафіляваны, у тым ліку з лёгкім запасам (для прыёму пацыентаў з COVID-19). Таму бальніцы, у прыватнасці Магілёўскай, Віцебскай і Брэсцкай абласцей, аднаўляюць звычайны рэжым працы. Па іншых рэгіёнах мы пакуль не будзем спяшацца».*

# Прадавец добрага настрою





Учора ў Мінску і сталічнай вобласці пачалі працаваць сезонныя (дзесяцідзённыя) кірмашы, дзе галоўны тавар — навагодняя ёлка. На перакрыжаванні мінскіх вуліц Магілёўскай і Жукоўскай размясціўся невялікі базарчык, загарадку якога ўпрыгожвае вывеска са словамі, знаёмымі кожнаму з маленства. Рэалізацыяй пушыстых прыгажунь тут займаецца Арцём БІРЫЛА. Дарэчы, не першы сезон Арцём заняты переднавагоднім гандлем і ведае, як прывабіць пакупнікоў: ласкава пагаварыць, шчыра ўсміхнуцца! Пакуль пакупнікі прыглядаюцца да маленькіх і высокіх дрэўцаў, да цэн на іх, але ўжо напярэдадні першых Каляд пачнуць актыўна набываць.

— Не проста рэалізоўваю хвойную прадукцыю. Я, між іншым, — прадавец святочнага настрою і пазітыўных эмоцый, — усміхаецца наш герой.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

- **Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Каранік узнагароджаны ордэнам Айчыны III ступені, Міністр аховы здароўя Дзмітрый Піневіч — ордэнам Пашаны.**
- Урад РФ адобрыў праект пагаднення аб выдзяленні Беларусі крэдыту на $1 млрд.
- **Прызыўная кампанія ў Беларусі прадоўжана ў сувязі з эпідсітуацыяй.**
- Мінэнерга плануе за 2021 год ацаніць магчымасць будаўніцтва другой АЭС у Беларусі.
- **Чарговы раўнд перагавораў Беларусі і Расіі па пастаўках газу плануецца на гэтым тыдні.**
- У Беларусі за выхадныя пад коламі аўто адзін чалавек загінуў і 18 траўміраваныя.
- **Праграму па павелічэнні спажывання насельніцтвам электраэнергіі плануецца прыняць у 2021 годзе.**
- Нацбанк падоўжыў на год ТК Банку прыпыненне ліцэнзіі на прыцягненне ўкладаў фізічных асоб.

Год малой радзімы: вынікі

**Мікалай ШАРСНЁЎ:**

## «Усё дзеля паляпшэння жыцця людзей!»

**Як прайшла трылогія Года малой радзімы на Віцебшчыне? Якія цікавыя праекты рэалізавалі? А можа, некаторыя атрымаюць працяг? Ці з'явіліся ідэі, якія ў бліжэйшым будучым плануюць ажыццявіць? Што такое малая радзіма асабіста для губернатара, які нарадзіўся на Віцебшчыне? І якія папярэднія вынікі працоўнай пяцігодкі? Пра гэта і іншае карэспандэнт «Звязды» пагутарыў са старшынёй Віцебскага аблвыканкама Мікалаем Шарснёвым.**



***— Вы родам з Аршаншчыны. Ці часта бываеце на сваёй малой радзіме? Што згадваеце пра часы, калі вы жылі там, у тыповай беларускай глыбінцы?***

— Я нарадзіўся ў вёсцы Прыгузкі. Гэта невялікая вёсачка. Сёння там крыху больш за паўсотню дамоў, з іх жылымі засталася толькі палова.

У школу хадзіў у суседнюю вёску Барздоўка, дзе цяпер настаўнікі-энтузіясты стварылі Музей гісторыі роднай вёскі, за што я ім вельмі ўдзячны. У ім жывуць дух мінулай эпохі і аптымістычны погляд у будучыню. Рэдкае адчуванне, якое дарагога варта...

СТАР. 4-5

На слыху

## 100 АДЦЕННЯЎ БЕЛАГА...

**Выпадковы здымак на мабільны, зроблены ў памяшканні для пераапранання медыкаў ковіднай зоны бальніцы, кранае сэрца. На ім — злоўленае імгненне. На мове адных толькі позіркаў чытаецца незвычайная пяшчота. Усё проста: матуля-ўрач прыбірае калегу-дачку ў асляпляльна белы ўбор і дае нямы наказ. «Звязда» адшукала герояў здымка на Гомельшчыне, у горадзе Рэчыца.**

### Пароль — «валанцёр»

Упершыню ў Беларусі студэнцкі валанцёрскі атрад барацьбы з COVID-19 Гомельскага дзяржмедуніверсітэта быў накіраваны на дапамогу ўрачам менавіта Рэчыцкай цэнтральнай раённай бальніцы. Добраахвотнікі — у пераважнай большасці ўраджэнцы райцэнтра, студэнты лячэбнага факультэта гомельскага «меда». Галоўным «сувязным» для валанцёраў у рабоце ў інфекцыйных аддзяленнях бальніцы і іх куратарам у «чырвонай» зоне стала Таццяна Лазарэвіч. У адной асобе — урач-тэрапеўт і загадчык інфекцыйнага аддзялення № 2 Рэчыцкай ЦРБ. Сюды на лячэнне трапляюць пацыенты з COVID-19.

СТАР. 6

ISSN 1990 — 763X


Кожны дзень – са «Звяздой»!

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2021 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцовы

